Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

Репозиторий ВГУ

**Т.А. Грачыха**

# БЕЛАРУСКАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ
**(факультатыўная дысцыпліна)**

Вучэбна-метадычныя матэрыялы

Віцебск
2013

**Вучэбная праграма**
**“Беларуская тэрміналогія (факультатыўная дысцыпліна)”**,
зацверджаная Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “ВДУ імя П.М. Машэрава” 25. 06. 2009, рэгістрацыйны № УД-09-009.

**Тлумачальная запіска**

Па назіраннях мовазнаўцаў, у апошнія дзесяцігоддзі ва ўсіх высокаразвітых мовах свету назіраецца з’ява актыўнай аўтанамізацыі групы лексікі, якую па адносінах да агульнаўжывальнага слоўніка называюць спецыяльнай. Кожнае “спецыяльнае” слова (і тэрмін у тым ліку), з аднаго боку, з’яўляючыся адзінкай агульнай сістэмы мовы, выконвае асноўныя функцыянальныя абавязкі прадстаўніка гэтай сістэмы. З другога боку, спецыфічнасць гэтых функцыянальных абавязкаў патрабуе ад тэрміна і праяўлення гэтых уласцівасцей. Вывучэнне працэсу нараджэння і жыцця тэрміна сведчыць пра тое, што яго разуменне далёка не заўсёды ўкладваецца ў вядомыя схемы мовазнаўства. Таму даследаванне толькі лінгвістычнай базы тэрміна з’яўляецца недастатковым у фарміраванні аб’ектыўнай тэорыі тэрміна. Недаацэнка гэтых асаблівасцей (як і спробы ігнаравання ўплыву лінгвістычных законаў на фарміраванне тэрміналогіі) прывяла да таго, што працэс распрацоўкі тэрміналагічнай тэорыі ў канцы XX ст. – стагоддзя навукова-тэхнічных рэвалюцый і колькаснага выбуху ў сям’і спецыяльнай лексікі – усё яшчэ застаецца далёкім ад вырашэння. Гэтыя абставіны робяць вывучэнне асноў тэрміналогіі адным з важнейшых элементаў лінгвістычнай адукацыі студэнтаў-філолагаў, далейшы навуковы і практычны лёс якіх можа быць цесна звязаны з гэтай праблемай, асабліва ва ўмовах Беларусі, дзе тэрміналагічная праца недастаткова распрацавана.

Мэта дысцыпліны, разлічанай на 34 гадзіны аўдыторных заняткаў, – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі, структурай і праблемамі сучаснай тэрміналогіі як навуковага кірунку, выклікаць у студэнтаў цікавасць да навукова-даследчай працы ў гэтай перспектыўнай галіне мовазнаўства.

Задачы дысцыпліны:
1)вызначэнне сутнасці паняццяў спецыяльнай лексікі і месца тэрміналогіі ў сістэме мовы;
аналіз ролі тэрміналогіі ў камунікатыўных працэсах; даследаванне спецыфічных праблем і тэндэнцый развіцця беларускай навуковай тэрміналогіі;
2) апісанне гістарычных вытокаў беларускай тэрміналогіі, асноўных сацыялінгвістычных фактараў яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы;
3) вывучэнне сучаснай беларускай тэрміналогіі ў структурна-семантычным і словаўтваральным аспектах;

Репозиторий ВГУ

4)даследаванне праблем упарадкавання, нармалізацыі, інтэрнацыяналізацыі і ўніфікацыі сучаснай беларускай тэрміналогіі;
5)аналіз тэрмінаграфічнай працы ў беларускім мовазнаўстве.

Дадзены курс дапаможа студэнтам асвоіць тэарэтычныя і практычныя пытанні тэрміназнаўства на сучасным этапе, набыць навыкі працы з тэрміналагічнымі слоўнікамі, з тэкстамі навуковага стылю, са спецыяльнай літаратурай, выконваць практычныя заданні для замацавання ведаў, пісаць даклады і рэфераты па найбольш важных праблемах навуковай тэрміналогіі, удзельнічаць у іх абмеркаванні, весці самастойны навуковы пошук праз напісанне курсавах і дыпломных прац па пытаннях курса. Набытыя ўменні і навыкі паспрыяюць эфектыўнай працы будучых спецыялістаў-філолагаў.

Курс “ Беларуская тэрміналогія” разлічаны на 34 гадзіны аўдыторных заняткаў ( лекцыйных – 20 гадзін, практычных – 14 гадзін).

Прыкладны тэматычны план

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекц. | практ. |
| 1. | Тэрміналогія як раздзел мовазнаўства | 2 | 1 |
| 2. | Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай тэрміналогіі | 2 | 1 |
| 3. | Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў савецкі перыяд. Сучасны стан развіцця | 2 | 1 |
| 4. | Разрады спецыяльнай лексікі | 2 | 1 |
| 5. | Агульналінгвістычная характарыстыка тэрміна | 2 | 1 |
| 6. | Беларуская тэрміналогія паводле паходжання | 2 | 1 |
| 7. | Структурная і лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў | 2 | 2 |
| 8. | Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння | 2 | 2 |
| 9. | Упарадкаванне і нармалізацыя сучаснай тэрміналогіі | 2 | 2 |
| 10. | Беларуская тэрмінаграфія | 2 | 2 |

Репозиторий ВГУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. ЗМЕСТ ПАНЯЦЦЯ “ТЭРМІНАЛОГІЯ”. ПРАДМЕТ, СТАТУС І ЗНАЧЭННЕ ТЭРМІНАЛОГІІ

Мэта заняткаў – пазнаёміць студэнтаў з гісторыя, структурай і значэннем паняцця *тэрміналогія*, якое ўключае ў сябе два асноўныя значэнні: навуковы кірунак, які вывучае разнастайныя лексіка-граматычныя асаблівасці тэрмінаў як спецыфічных намінатыўных адзінак, і сутнасць тэрмінаў якой-небудзь галіны ведаў. Студэнты павінны добра сабе ўявіць, што, нягледзячы на адносна доўгую гісторыю і значны аб’ём даследаванняў,

дадзенае праблема ўсё яшчэ далёкая ад вырашэння. Прычына такога стану ў тым, што да апошняга часу непаслядоўна праводзілася размежаванне такіх паняццяў, як *тэрміналогія як навука і тэрміналогія як сукупнасць тэрмінаў*, не вызначаны лінгвістычны статус як уласна тэрміна, так і тэрміналогіі ў цэлым. Неабходна паказаць студэнтам перспектыўнасць тэрміналогіі як аўтаномнага навуковага напрамку, яе магчымыя раздзелы, прадмет, задачы, месца ў сістэме навук.

Тэма 2. ГІСТОРЫЯ І АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ І ЗАМЕЖНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Мэта заняткаў – паказаць гісторыю і асноўныя этапы станаўлення тэрміназнаўства як навуковага напрамку, пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі тэрміналагічнымі школамі і напрамкамі іх работы. У гэтай сувязі прынцыпова неабходна адзначыць, што прыярытэт у гэтай галіне належыць двум цэнтарм, якія паралельна працуюць: у Расіі (Д.С.Лотэ, А.А.Рэфармацкі) і ў Аўстрыі (Е.Вюстэр). Развіццё тэрміналогіі – вынік разумення таго, што з’яўленне вялікай спецыфічнай групы лексікі (“навукова-тэхнічных неалагізмаў”) павінна абапірацца на разуменне законаў тэрміназнаўства наогул і на правілы фарміравання канкрэтных тэрмінасістэм.

Сучасная літаратура дыскутуе дзве тэндэнцыі развіцця тэрміналогіі. Першая: механізмы і моўныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў тэрміналогіі, па сутнасці, тыя ж самыя, што і сродкі намінацый агульнанароднай мовы. Другая сыходзіць з таго, што ў найбольш развітых у навукова-тэхнічных адносінах мовах свету назіраюцца з’явы, якія можна назваць узрастаннем аўтаноміі груп спецыяльнай лексікі.

Апошнія даследаванні праводзяць думку, што ідэальныя тэрміны наогул не могуць мець лексічнай матывацыі, а могуць існаваць толькі на аснове канвенцыянальнасці.

У беларускім мовазнаўстве апошніх дзесяцігоддзяў разглядаюцца тэарэтычныя і практычныя пытанні стварэння навуковай і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі на беларускай мове, удзяляецца ўвага разнастайнай мовазнаўчай праблематыцы, звязанай як з тэрмінамі на чыста беларускамоўнай аснове, так і з інтэрнацыянальнымі элементамі ў іх, аналізуюцца праблемы развіцця і функцыянавання сучаснай беларускай тэрміналогіі. Асаблівая ўвага надаецца апісанню гістарычных вытокаў беларускай тэрміналогіі, асноўных сацыялінгвістычных фактараў яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы, характарыстыцы сучаснай беларускай тэрміналогіі паводле паходжання, граматычных і семантычных асаблівасцей, пытанням упарадкавання сучаснай беларускай тэрміналогіі, працэсам інтэрнацыяналізацыі і міжнароднай уніфікацыі сучаснай тэрміналогіі. Вывучэннем праблем беларускай тэрміналогіі займаюцца В.П.Красней, Л.А.Антанюк, Г.А.Цыхун, Г.У.Арашонкава, У.В.Люшцік і інш.

Тэма 3. ТЭРМІНЫ І НОМЕНЫ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫЯ КЛАСЫ НАМІНАТЫЎНАЙ ЛЕКСІКІ

Рэпазіторый ВДУ

Асноўная мэта заняткаў па дадзенай тэме – паказаць студэнтам, што недаацэнка адрозненняў паміж выразамі “канвенцыянальнымі і натуральнымі” (Ю.Люкшын), г. зн. паміж уласна тэрмінамі і лексемамі агульнанароднага характару, тоіць у сабе значную небяспеку, таму што можа выклікаць нігілістычныя адносіны да ўпарадкавання тэрмінасістэм, прывесці да суб’ектывізму ў фарміраванні і афармленні навуковых намінацый, што і назіраецца ў маладых (у навукова-тэхнічным плане) мовах. А.А.Рэфармацкі, Г.О.Вінакур, А.В.Суперанская, В.П.Даніленка значна рушылі наперад у плане размяжоўвання паняццяў тэрмін і номен. У працэсе заняткаў неабходна максімальна падрабязна прааналізаваць прапанаваныя гэтымі і іншымі лінгвістамі асноўныя прыметы кожнай з названых груп намінатыўнай лексікі.

Тэма 4. АГУЛЬНАЛІНГВІСТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ТЭРМІНА

Мэта заняткаў – паказаць, што тэрмін з’яўляецца звычайнай намінатыўнай адзінкай мовы, якая, аднак, валодае шэрагам лексіка-граматычных асаблівасцей, якія вылучаюць тэрміны ў самастойны клас слоў. У адрозненне ад агульнанароднай лексічнай адзінкі, тэрмін мае ярка выражаную семіятычную прыроду і, значыць, схільны да фармалізацыі. Тэрмін характарызуюць такія катэгорыі, як сістэмнасць у суадносінах знака і абазначанага, адно – адназначнасць, неэкспрэсіўнасць, адсутнасць сінаніміі, стылёвая нейтральнасць. У дадзенай лекцыі неабходна раскрыць паняцце *камунікатыўна-намінатыўны характар тэрміна як спецыяльнай лексічнай адзінкі для спецыфічных камунікатыўных сітуацый.*

Тэма 5. ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ТЭРМІНА

Пры вывучэнні гэтай тэмы неабходна спыніцца на наступных момантах: структурныя тыпы тэрмінаў, структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў (прыродазнаўчанавуковых, грамадска-палітычных), суадносіны тэрмінаў і часцін мовы, марфемная структура тэрмінаў, асноўныя тыпы ўтварэння тэрмінаў (марфалагічныя, лесіка-сінтаксічныя), марфалагічныя сродкі ўтварэння тэрмінаў (паняцце пра тэрмінаэлемент), паняцце пра аманімію ў тэрміналогіі.

Тэма 6. ПРАБЛЕМА КЛАСІФІКАЦЫІ Ў ТЭРМІНАЛОГІІ

Класіфікацыя – аснова любога навуковага даследавання, паколькі ёй удаецца выдзеліць і апісаць новыя, спецыфічныя прыметы з’явы, якая даследуецца. Адзін са слабых бакоў сучаснай тэрміналогіі як навукі якраз і заключаецца ў тым, што класіфікацыйная работа тут знаходзіцца яшчэ ў пачатковай стадыі. В. Навіцкі, М. Юркоўскі, Ст. Груча, А.А. Рэфармацкі, В.П. Даніленка, П.Н. Дзянісаў, А.В. Суперанская вызначылі шляхі падыходу да праблемы, але не дасягнулі ўзаемаразумення. Адны лічаць найбольш аптымальнай класіфікацыю тэрмінаў па галінах навук, іншыя – па структуры тэрміна. Вядомыя і іншыя падыходы да класіфікацыі тэрмінаў: *паводле*

Репозиторий ВГУ

*паходжання, паводле ўтварэння, паводле суадносін з лексемамі агульнага характару*. Пазнаёміўшы студэнтаў з асаблівасцямі кожнага з гэтых падыходаў, неабходна ўсё ж звярнуць увагу на тое, што тэрмін – з'ява двухбаковая: гэта і адзінка мовы, і спецыфічны інструмент вучонага, які прадстаўляе пэўную галіну ведаў. Значыць, класіфікацыйныя намаганні даследчыкаў аб'ектыўна распадаюцца на два напрамкі: *лінгвістычная* класіфікацыя і *тэрміналагічная* класіфікацыя. Апошняя, у сваю чаргу, як і ўласна тэрмін, неадзельная ад навуковага напрамку, якія яна абслугоўвае.

Тэма 7. АСНОЎНЫЯ ШЛЯХІ І СПОСАБЫ ТЭРМІНАЎТВАРЭННЯ

Пры вывучэнні дадзенай тэмы неабходна даць агульную характарыстыку асаблівасцей тэрміналагічнага словаўтварэння на агульным сінхронным фоне спосабаў словаўтварэння ў беларускай мове з выкарыстаннем супастаўляльнага матэрыялу іншых моў. Затым падрабязна спынімся на спосабах утварэння канкрэтных груп тэрмінаў. У аснову можа быць пакладзена класіфікацыя, прапанаваная В.П. Даніленка: крыніцы фарміравання і спосабы ўтварэння тэрмінаў для прадметных паняццяў; крыніцы фарміравання і спосабы ўтварэння тэрмінаў для абстрактных паняццяў, для абазначэння працэсаў, дзеянняў і стану; тэрміналагізацыя розных часцін мовы; запазычанні ў тэрміналогіі і адносінах да іх.

Тэма 8. ПРАБЛЕМА ЎПАРАДКАВАННЯ І НАРМІЛІЗАЦЫІ Ў ТЭРМІНАЛОГІІ

Пры вывучэнні дадзенай тэмы неабходна разгледзець наступныя пытанні: што такое *моўна норма* і ў сувязі з гэтым як трэба разумець выраз *тэрмін павінен адпавядаць нормам мовы.* Пра значэнне праблемы гаворыць той факт, што ва ўсіх развітых у навукова-тэхнічных адносінах моваю складаюцца спецыяльныя тэрміналагічныя камісіі, якія аб'ядноўваюцца ў міжнародныя арганізацыі, напрыклад, JSO ў Жэневе або JNEOTERM ў Вене. Гэтыя арганізацыі ставяць за мэту работу па стандартызацыі тэрміналогіі, Якія крытэрыі могуць і павінны вызначаць тэрміналагічную норму? На думку В.П. Даніленкі, ,,правільнасць тэрміна пачынаецца з правільнасці яго ўтварэння", адпаведнасці мадэляў утварэння мадэлям роднай мовы, з аднаго боку, і магчымасцям інтэрнацыянаянальлізацыі, з другога. У гэтым плане ў другой частцы лекцыі пажадана прааналізаваць некалькі тэрмінаў розных галін ведаў. Ілюстрацыйны матэрыял можа быць узяты з беларускіх і рускіх слоўнікаў.

Тэма 9. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ТЭРМІНАГРАФІІ

У сувязі з тым, што паняцце *тэрміналогія* доўгі час падмяняла паняцце *тэрмінаграфія*, неабходна правесці дакладнае размежаванне гэтых паняццяў, паказаўшы, што задача тэрмінаграфіі – сістэмнае апісанне спецыяльнай лексікі, якая выкарыстоўваецца ў навукова – тэхнічных тэкстах. Далей неабходна раскрыць гісторыю і прычыны з'яўлення першых слоўнікаў спецыяльнай лексікі, расказаць пра задачы і асаблівасці ўтварэння сучаснай

Рэпазіторый ВДУ

тэрмінаграфічнай працы, паказаць спецыфіку пабудовы слоўнікавага артыкула ў тэрміналагічным слоўніку ў параўнанні са слоўнікамі іншых тыпаў, прывесці прыклады сучасных галіновых слоўнікаў, даць ім параўнальную характарыстыку. Неабходна асобна спыніцца на гісторыі, задачах і асаблівасцях тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі, пачынаючы з 20- х гадоў XX ст. і заканчваючы апошнімі дзесяцігодзямі.

## ЛІТАРАТУРА

Асноўная


1. Акуленко В.В. Научно – техническая революция и проблема интернациональной терминологии // Научно- техническая революция и функционирование языков мира. М., 1977.
2. Акуленко В.В. Лексические интернационализмы: Итоги, перспективы, методы исследования // Интернацыональные элменты в лексике и терминологии. Харьков, 1980.
3. Антанюк Л.А., Бірыла М.В. Развіццё беларускай лінгвістычнай тэрміналогіі і праблемы яе ўпарадкавання // Славянская лингвистическая терминология. Киев: Наукова думка, 1984.С. 5 – 15.
4. Антанюк Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне. Мн., 1987.
5. Антанюк Л.А. Сучасная беларуская тэрміналогія. Мн., 1995.
6. Антанюк Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія. Мн., 2002.
7. Головин Б.Н., Кобрин Р.Ю. Лингвистические основы учения о терминах. М., 1987.
8. Даниленко В.П. Русская терминология: Опыт лингвистического описания. М., 1977.
9. Канделаки Т.Л. Семантика и мотивированность терминов. М., 1977.
10. Красней В.П. Генетычная характырыстыка беларускай тэрміналагічнай лексікі пачатку XX ст. // Веснік БДУ імя У.І. Леніна. Сер. IV. 1980. №3. С. 21 – 22.
11. Лингвистические проблемы научно – технической терминологии. М., 1970.
12. Ляшчынская В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка. Мн., 2001.
13. Реформажский А.А. Что такое термин и терминалогия? // Вопросы терминологии. М., 1961.
14. Практыкум па беларускай мове / Пад рэд. Г.М. Малажай., 1993.
15. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. Мн., 1999.


Дадатковая


1. Антанюк Л.А. Развіццё і задачы ўпарадкавання беларускай навуковай тэрміналогіі //Тэрмінал.зб-к “83”. Мн., 1985.-С. 5-17.


Репозиторий ВГУ

2. Антонюк Л.А. О терминологическом словосочетании как номинативной единице // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Тезисы докл. республ. Конференции. Гродно, 1982. Ч.2 – С.8-10.
3. Бородич М.А., Гируцкий А.А., Чернышова Л.В. Сопоставительный курс русского и белорусского языков. Мн. 1999.
4. Булыка А.М. Выкарыстанне інтэрнацыянальных прэфіксальных сродкаў у беларускай тэрміналогіі // Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997г.) Мн. 1998.- С.96-99.
5. Даниленко В.П. О терминологическом словообразовании // Вопросы языкознания. М., 1973. - №4. –С. 76-83.
6. Даниленко В.П. Русская терминология. Опыт лингвистического описания. – М., 1997.
7. Красней В.П. Да пытання аб вывучэнні беларускай тэрміналагічнай лексікі 20-х гадоў// Весн. БДУ. Сер.4. 1984. - №3. –С. 13-17.
8. Красней В.П. Навуковы стыль сучаснай беларускай літаратурнай мовы // Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі ( Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. – С. 16 – 19.
9. Красней В.П. Некаторыя асаблівасці выпрацоўкі і ўдасканалення беларускай тэрміналогіі ў савецкі час //Весці БДУ. Сер.4. 1997. -№2. – С. 28-32.
10. Красней В.П. Роля жывой народнай мовы ў фарміраванні і развіцці беларускай тэрміналагічнай лексікі //Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры: Тэз. дакл. 2 рэсп. навук.канф. Гомель, 1980. –С. 64-65.
11. Лапкоўская А.М. Некаторыя пытанні развіцця і станаўлення беларускай батанічнай тэрміналогіі //Беларуская мова ў другой палове XX ст.: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. – С. 124-127.
12. Лотте Д.С. Вопросы заимствования и упорядочения иноязычных терминов и терминоэлементов. М., 1982.
13. Лотте Д.С. Основы построения научно-технической терминологии. Вопросы теории и методики. М., 1961.
14. Михайлишин Б.П. Природа, функции и стилевые характеристики терминов-аббревиатур //Беларуская мова ў другой палове XX ст.:Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22-24 кастрычніка 1997 г.). Мн., 1998. – С. 130-138.
15. Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі //Матэр. 1-ай нац. канф. Мн., 1995.
16. Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі //Матэр. рэспубл. навук. канф. Гомель, 1994.
17. Станкевіч А.А. Дэтэрміналагізацыя тэрмінаў іншамоўнага паходжання ў сучаснай беларускай мове //Белар. мова. – 1997. – Вып. 5 – С. 27-34.

Репозиторий ВГУ

18. Сцяцко П.У. Дзеепрыметнікавая тэрміналагічная лексіка рускай мовы і яе адпаведнікі ў беларускай //Навуково-технічный прогрес і проблема термінології: Тез. доп. Респ. конф. Кіев, 1980. – С. 162-163.
19. Шчэрбін В.К. Асноўныя этапы тэрмінатворчай дзейнасці //Тэрмінал. Зб-к «89/90». Мн., 1992. – С. 4-8.

Слоўнікі:

20. Беларуская савецкая энцыклапедыя: У 12 т. Мн.. 1970 – 1975.
21. Беларуская Энцыклапедыя: У 18 т. – Т.1 11. Мн., 1996 – 2000.
22. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1999.
23. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: У 5 т. Мн., 1983 – 1986.
24. Анатомія і марфалогія бесхрыбетных жывёл: Руска-беларускі слоўнік/Беларус. Дзярж. пед. ун-т; Скл. А.Р.Алексаедровіч, У.С. Бірг. Мн., 1997.
25. Анаціраваны спіс хрыбетных жывёл Беларусі: Метадычныя рэкамендацыі/ Мін. Дзярж. пед. ін-т; Укл. А.Р.Алексаедровіч, У.М.Дучыц, Т.М.Курскова, Н.П.Лобань, А.У.Хандогі. Мн., 1993.
26. Андрыеўская З., Галай І. Руска-беларускі фізіка-геаграфічны слоўнік. Мн., 1993.
27. Аранская В., Слабін У. Руска-беларускі тлумачальны слоўнік вытворча-значных і паняццяў па хіміі /Віцеб. дзярж. пед. ін-т. Віцебск, 1993.
28. Беларуска-рускі тэрмілагічны тлумачальны слоўнік па батаніцы і кветкаводстве / Беларус. дзярж. тэхнал. Ун-т; Скл. Т.М.Бурганская, Л.С.Пашкевіч, А.І.Скорабагатая; Нав. рэд. В.Р. Анціпаў. Мн., 1996.
29. Болсун А.І., Рапановіч Я.Н. Слоўнік фізічных і астранамічных тэрмінаў: Для сярэд. шк. Мн., 1979.
30. Воднеў У.Т., Навумовіч А.Ф., Навумовіч Н.Ф. Малы матэматычны слоўнік. Мн., 1994.
31. Галай І.П., Сідор С.І. Геаграфічны слоўнік школьніка /Пад рэд. В.А. Жучкевіча. Мн., 1986.
32. Геаграфічныя паняцці і тэрміны: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.
33. Інфарматыка: Беларуска-рускі тэрміналагічны слоўнік/ Пад агульнай рэд. А.І. Паўлоўскага. Мн., 1996.
34. Калугін А.С. Тэрміналагічны беларуска-рускі слоўнік па анатоміі і фізіялогіі чалавека і жывёл для студэнтаў біялагічнага і фізкультурнага факультэтаў /Гомел. дзярж. ун-т. Гомель, 1994.
35. Кароткі руска-беларускі слоўнік біялагічнай тэрміналогіі /Віцеб. дзярж. пед. ін-т; Скл. Т.М.Царэнка. Віцебск, 1994.
36. Кароткі руска-беларускі слоўнік музычных тэрмінаў /Скл. А.І.Смагін, Н.В. Шутовіч. Мн., 1992.
37. Кароткі руска-беларускі слоўнік прыродазнаўчай тэрміналогіі для пачатковых класаў /Магіл. Дзярж. пед. ін-т; Укл. М.П.Бузук, А.Л.Курдзюкоў; Рэд. А.С.Лаўшук. Магілёў, 1991.

Рэпазіторый ВГУ

38.Кароткі руска-беларускі тлумачальны слоўнік па агульнай біялогіі /Беларус. Дзярж. пед. ун-т; Укл. М.Д.Лісаў, П.А.Міхайлаў, Э.А.Камінская, Г.А.Пісарчык. Мн., 1994.
39.Кароткі тлумачальны слоўнік педагагічных тэрмінаў / Укл. А.І. Андарала, Г.Ф. Андарала. Мн., 1995.
40.Кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў па мікрабіялогіі /Мін. Дзярж. пед. ін-т; Скл. Р.У.Тузава, К.М.Панюціч. Мн.,1991.
41.Падручны руска-беларускі слоўнік біялагічных тэрмінаў /Беларус. Дзярж. ун-т. Аўт.-скл. І.Л.Бурак, Т.П.Пілiповіч. Мн., 1992.
42.Радкевич В.А., Вардомацкий Л.М., Лешко А.А. Биологическая терминология и номенклатура: Словарь русско-белорусско-латинский, белорусско-русский. Мн., 1993.
43.Руска-беларускі слоўнік па псіхалогіі / Скл. Т.У. Васілец, Я.Л.Каламінскі, Р.А. Макарэвіч. Мн., 1991.
44.Руска-беларускі слоўнік хімічных тэрмінаў /Беларус. Дзярж. пед. ун-т; Укл. І.А.Семяновіч, А.С.Ціханаў, В.В.Канаш. Мн., 1995.
45.Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Мн., 1994.
46.Руска-беларускі тлумачальны слоўнік па фізіялогіі чалавека і жывёл /Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка; Склад. А.Р. Александровіч, С.П. Амуросьева і інш.
47.Русско-белорусский математический словарь / Под ред. Я.В. Радыно. Мн., 1993.
48.Русско-белорусский словарь по морфологии и анатомии растений /Белорус. гос. пед. ун-т; Сост. Л.М.Ерей, С.Т.Кухарева, Т.Н.Никитина. Мн., 1993.
49. Руско-белорусский словарь по физиологии растений /Мин. гос. пед. ин-т; Сост. Л.Б.Утыро. Мн., 1992.
50.Русско-белорусский терминологический словарь по физической географии /Сост. Б.Н. Гурский, А.М. Баско. Мн., 1990.
51.Сухая Т., Еўдакіменка Р., Траццякевіч В., Гудзень Н. Тэрміналагічны слоўнік па вышэйшай матэматыцы для ВНУ /Навук. рэд. П. Міхайлаў. Мн., 1993.
52.Тэрміналагічныя слоўнікі (асобныя выданні) 1918 – 1998 гг.: (Бібліягр. давед. Рэд. Г.Цыхун. Мн., 2000.
53.Экалагічны слоўнік. – Экологический словарь: Кн. для вучняў /Пад рэд. Кручковай. Мн,, 1993.
54.Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. Мн,, 1992.

Репозиторий ВГУ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

Тэма 1. **Тэрміналогія як раздзел мовазнаўства**

*Пытанні:*

1. Склад, аб'ём і межы спецыяльнай лексікі. Змест паняцця "тэрміналогія".
2. Тэрміназнаўства як новая навуковая дысцыпліна, яе прадмет, асноўныя задачы, месца ў сістэме навук.
3. Лінгвістычная і тэрміналагічная класіфікацыя ў тэрміналогіі.
4. Асноўныя этапы развіцця развіцця тэрміназнаўства. Асноўныя тэрміналагічныя школы і напрамкі іх працы.
5. Стылі. Навуковы стыль, яго асаблівасці. Тэрміналогія ў навуковым стылі.
6. Моўныя асаблівасці навуковых тэкстаў.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія: вучэб. дапам. / Антанюк Л.А. –Мінск, 2002.

Тэма 2. **Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай тэрміналогіі. Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў савецкі перыяд. Сучасны стан развіцця**

*Пытанні:*

1. Гістарычныя вытокі фарміравання беларускай тэрміналогіі. Асноўныя сацыялінгвістычныя фактары яе развіцця на розных этапах фарміравання беларускай мовы.
2. Утварэнне тэрмінасістэм розных галін ведаў: грамадска-палітычная, юрыдычная, гандлёвая, сельскагаспадарчая, промыславая, ваенная, мовазнаўчая.
3. Распрацоўка беларускай тэрміналогіі ў 20-30-я гады ХХ ст.
4. Распрацоўка беларускай тэрміналогіі ў 2-ой палове ХХ ст.
5. Асаблівасці развіцця беларускай тэрміналогіі ў 80-90-я гады ХХ ст. Сучасны стан яе развіцця.
6. Энцыклапедычныя і тэрміналагічныя выданні. Працы беларускіх мовазнаўцаў па тэрміналогіі.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.

Репозиторий ВГУ

2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.

Тэма 3. **Разрады спецыяльнай лексікі. Агульналінгвістычная характарыстыка тэрміна**

*Пытанні:*

1. Разрады спецыяльнай лексікі: тэрміналогія, наменклатура, прафесіяналізмы.
2. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў: сістэмнасць, адназначнасць, неэкспрэсіўнасць, стылёвая нейтральнасць, імкненне да адсутнасці сінаніміі.
3. Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі: полісемія, аманімія, сінанімія, антанімія, гіпанімія.
4. З’явы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі ў тэрміналагічнай лексіцы.
5. Адносіны паміж тэрмінамі і агульнаўжывальнымі словамі.
6. Адносіны паміж тэрмінамі і наменклатурай, размежаванне паняццяў тэрмін і номен у навуковых даследаваннях.
7. Адносіны паміж тэрмінамі і прафесіяналізмамі.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.

Тэма 4. **Беларуская тэрміналогія паводле паходжання**

*Пытанні:*

1. Спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка ў складзе тэрмінасістэм.

Репозиторий ВГУ

2. Агульнаўжывальныя словы як крыніца развіцця тэрміналагічных сістэм Утварэнне тэрмінаў шляхам тэрміналагізацыі агульналітаратурных слоў.
3. З'ява метафарызацыі ў стварэнні навуковых тэрмінаў.
4. Сэнсавы пераклад і калькаванне рускіх тэрмінаў.
5. Запазычванне іншамоўных тэрмінаў.
6. Інтэрнацыянальныя элементы ў тэрміналогіі.

*Літаратура:*


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.


Тэма 5. **Структурная і лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў**

*Пытанні:*

1. Структурныя тыпы тэрмінаў: тэрміны-словы, тэрміны-словазлучэнні, тэрміны-сімвалы.
2. Структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў.
3. Суадносіны тэрмінаў і часцін мовы. Лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў.
4. Асаблівасці функцыянавання розных часцін мовы ў тэрміналогіі: назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, дзеепрыметнік, прыслоўе. Спрэчнасць поглядаў на лексіка-граматычную характарыстыку тэрмінаў.

*Літаратура:*


1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003. – С.343-441.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.


Репозиторий ВГУ

6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.

Тэма 6. **Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння**

*Пытанні:*

1. Асноўныя спосабы ў тэрміналагічным словаўтварэнні: марфалагічны, сінтаксічны, семантычны.
2. Марфалагічны спосаб як асноўны ў тэрмінатворчасці, яго адметныя рысы, словаўтваральныя мадэлі.
3. Праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай тэрміналогіі.
4. Прадуктыўнасць сінтаксічнага спосабу тэрмінаўтварэння, яго асаблівасці.
5. Семантычны спосаб утварэння тэрмінаў. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя розных часцін мовы.
6. Адрозненні тэрмінаўтварэння ў параўнанні з агульналітаратурным словаўтварэннем.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.

Тэма7. **Упарадкаванне і нармалізацыя сучаснай тэрміналогіі**

*Пытанні:*

1. Адпаведнасць тэрміна моўным нормам. Крытэрыі, якія вызначаюць тэрміналагічную норму: адпаведнасць мадэляў утварэння мадэлям роднай мовы, магчымасць інтэрнацыяналізацыі.
2. Стандартызацыя тэрміналогіі.
3. Задачы ўпарадкавання сучаснай беларускай тэрміналогіі.

Репозиторий ВГУ

4. Асноўныя этапы тэрмінатворчай дзейнасці.
5. Асноўныя аспекты ўпарадкавання тэрміналогіі.
6. Інтэрнацыяналізацыя і міжнародная ўніфікацыя сучаснай беларускай тэрміналогіі.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.
9. Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя-і герпетафаўны Беларускага Паазер'я / Т.А. Грачыха. – Віцебск, 2006.

Тэма 8. **Беларуская тэрмінаграфія**

*Пытанні:*

1. Задачы беларускай тэрмінаграфіі.
2. Асаблівасці пабудовы слоўнікавага артыкула ў тэрміналагічным слоўніку.
3. Асаблівасці тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі на розных этапах развіцця беларускай мовы (з 20-х гадоў XX ст. па наш час)
4. Характарыстыка сучасных галіновых слоўнікаў, мовазнаўчая праблематыка ў іх.
5. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі.
6. Метадалагічныя, сацыялінгвістычныя, камп'ютарныя праблемы сучаснай беларускай тэрмінаграфіі.

*Літаратура:*

1. Плотнікаў, Б.А., Антанюк, Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск, 2003.
2. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Арашонкава Г.У., Булыка А.М., Люшцік У.В., Падлужны А.І.; навук. рэд. А.І. Падлужны. – Мінск, 2001.
3. Ляшчынская, В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.

Рэпазіторый ВДУ

4. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: Фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Антанюк Л.А. – Мінск, 1897.
5. Антанюк, Л.А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія/ вучэб. дапам. / Антанюк Л.А.–Мінск, 2002.
6. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэб.-метад. дапам./ В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, М.М. Круталевіч. – Мінск, 2005.
7. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапам. / А.М. Лапкоўская. – Гродна, 2009.
8. Семянькова, Г.К. Беларуская мова (спецыяльная лексіка): вучэб.-метад. комплекс / Г.К. Семянькова. – Віцебск, 2004.
**9.** Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя-і герпетафаўны Беларускага Паазер'я / Т.А. Грачыха. – Віцебск, 2006.

**Пытанні**
**па дысцыпліне "Беларуская тэрміналогія"**

1. Навуковы стыль, яго характарыстыка. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
2. Марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
3. Паняцце аб спецыяльнай лексіцы і тэрміналогіі. Тэрміназнаўства як новая навуковая дысцыпліна, яе прадмет, задачы, месца ў сістэме навук, праблемы і перспектывы.
4. Тэрмін і яго характэрныя прыкметы. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў.
5.Семантычныя працэсы ў тэрміналогіі: полісемія, сінанімія, антанімія, гіпанімія.
6. Разрады спецыяльнай лексікі: тэрміны, наменклатурныя назвы, прафесіяналізмы. Узаемаадносіны паміж імі і размежаванне дадзеных паняццяў.
7. Фарміраванне і развіццё беларускай тэрміналогіі розных галін ведаў (грамадска-палітычная, юрыдычная, гандлёвая, сельскагаспадарчая, промыславая, ваенная тэрміналогія).
8. Фарміраванне і развіццё беларускай мовазнаўчай тэрміналогіі.
9. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 20-30-я гады XX ст.
10. Распрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 2-ой палове XX ст.
11. Асаблівасці развіцця і функцыянавання беларускай тэрміналогіі на сучасным этапе.
12. Спрадвечна беларуская лексіка ў складзе тэрмінасістэм. Агульнаўжывальныя словы як крыніца развіцця тэрміналагічных сістэм.
13. Калькаванне рускіх тэрмінаў і запазычванне іншамоўных тэрмінаў у беларускай тэрміналогіі. Выкарыстанне інтэрнацыянальных элементаў.
14. Структурныя тыпы тэрмінаў: тэрміны-словы, тэрміны-словазлучэнні, сімвалы-словы. Структурныя асаблівасці тэрмінаў розных галін ведаў.
15. Лексіка-граматычная характарыстыка тэрмінаў. Асаблівасці функцыянавання розных часцін мовы ў тэрміналогіі.

Рэпазіторый ВДУ

16. Дзеепрыметнік у беларускай тэрміналогіі, асаблівасці яго функцыянавання.
17. Асноўныя спосабы тэрмінаўтварэння: марфалагічны, сінтаксічны, семантычны. Сінтаксічны спосаб утварэння тэрмінаў, яго характарыстыка.
18. Марфалагічны спосаб утварэння тэрмінаў (прэфіксальны, суфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, аснова- і словаскладанне, складана-суфіксальны, бяссуфіксны, абрэвіятурны).
19. Праблемы словаўтварэння ў сучаснай беларускай тэрміналогіі. Дэрывацыйныя структуры ў тэрміналагічных слоўніках 90-х гадоў XX ст.
20. Семантычны спосаб утварэння тэрмінаў.
21. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя розных часцін мовы ў тэрміналогіі.
22. Паняцце пра тэрмінаэлемент. Асноўныя адметнасці тэрмінаўтварэння ў параўнанні з агульналітаратурным словаўтварэннем.
23. Вырашэнне праблем унармавання сучаснай беларускай тэрміналогіі: праблемы правапісу і формазмянення.
24. Асаблівасці тэрмінаграфічнай працы ў Беларусі на розных этапах развіцця беларускай мовы.
25. Беларускія энцыклапедычныя і галіновыя слоўнікі, іх характарыстыка.
26. Асноўныя напрамкі сучаснай беларускай тэрмінаграфіі (праектыўная, нарматыўная, апісальная тэрмінаграфія).
27. Камп'ютарныя праблемы беларускай лексікаграфіі і тэрмінаграфіі.

## Узоры тэставых заданняў па дысцыпліне "Беларуская тэрміналогія"

1. Якая часціна мовы не выкарыстоўваецца ў навуковых тэкстах:
1) злучнік
2) займеннік
3) выклічнік
4) прыназоўнік
5) часціцы

2. Якія тыпы сказаў з'яўляюцца найбольш ужывальнымі ў мове навукі:
1) простыя
2) складаназлучаныя
3) складаназалежныя
4)складаныя бяззлучнікавыя

3. Вызначце разнавіднасці навуковага стылю:
1) уласна навуковы (акадэмічны)
2) уласна заканадаўчы
3) навукова-вучэбны
4) навукова-папулярны

Репозиторий ВГУ

5) навукова-тэхнічны

4. Вызначце асаблівасці мовы навуковых тэкстаў:
1) ужыванне абрэвіятур і скарачэнняў
2) ужыванне сімвалаў і формульных абазначэнняў
3**)** ужыванне тэрмінаў
4) ужыванне размоўных фразеалагізмаў

5. Адзначце спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў:
1) Адназначнасць
2) наяўнасць экспрэсіі, эмоцыі
3) адсутнасць экспрэсіі, эмоцыі
4) сістэмнасць
5**)** наяўнасць дэфініцыі

6. Якія групы тэрмінаў вылучаюць паводле структуры:
1) тэрміны-словы
2) тэрміны-словазлучэнні (састаўныя тэрміны)
3) тэрміны-сімвалы
4) запазычанні
7. Якімі часцінамі мовы выражаюцца словы-тэрміны ў навуковай літаратуры і тэрміналагічных слоўніках:
1) назоўнікамі
2) прыметнікамі
3) дзеясловамі
4) прыслоўямі
5) дзеепрыслоўямі

8. Вызначце, якія з прыведзеных слоў сталі тэрмінамі ў лінгвістыцы ў выніку працэсу тэрміналагізацыі:
1) корань
**2)** аснова
3) сказ
4) арфаграфія

9. Назавіце асноўныя разрады спецыяльнай лексікі:
1) дыялектызмы
2) жарганізмы
3) тэрміны
4) наменклатурныя назвы
5) прафесіяналізмы

10. Якія этапы вызначаюць у развіцці тэрміназнаўства як навуковай дысцыпліны:
1) 30-60-я гады XX ст.

Репозиторий ВГУ

2) пачатак XX ст. – 1917 г.
3) канец 60-х – 80-я гады XX ст.
4) канец 80-х – па наш час
5) 50-я – 90-я гады XX ст.

**ЗМЕСТ**


1. Вучэбная праграма "Беларуская тэрміналогія"……………….
2. Літаратура
3. Практычныя заняткі ………………………………………………..
4. Пытанні………………………………………………………………
5. Узоры тэставых заданняў……………………………………..


Репозиторий ВГУ